## Участникам XIX Минской международной книжной выставки-ярмарки

Дорогие друзья!

Сердечно приветствую вас с открытием XIX Минской международной книжной выставки-ярмарки.

В Республике Беларусь 2012 год объявлен Годом книги и призван популяризировать национальную литературу. Символично, что он совпал со 130-летним юбилеем со дня рождения белорусских классиков Янки Купалы и Якуба Коласа. Их произведения не только возвеличивают нашу Родину, но до сих пор оказывают глубочайшее влияние на души людей, на их самосознание.

Мы видим, насколько велик в стране интерес к печатному слову. Уверен, что данный форум придаст новый импульс развитию отечественного книгоиздания, приблизив белорусскую литературу к зарубежному читателю.

За время своего проведения выставка-ярмарка уже стала знаковым событием в духовной жизни нашего государства. Его по праву можно назвать масштабным смотром достижений издателей разных стран и авторитетной площадкой для обмена опытом профессионалов.

Желаю всем участникам этого мероприятия плодотворной работы, взаимопонимания, вдохновения и оптимизма.

**Президент Республики Беларусь**
**Александр ЛУКАШЕНКО**

КНІЖНЫ СВЕТ

# Залатыя фаліянты

4




**Гран-пры нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі – 2012" атрымала выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" за выданне "Дмитрий Струков. Альбом рисунков. 1864 – 1867"**

КНІЖНЫ СВЕТ

# Залатыя фаліянты

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**Уручэнне ўзнагарод пераможцам нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі", які ў пяцьдзясят першы раз прайшоў у нашай краіне напярэдадні адкрыцця XIX Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, стала сапраўдным святам для кнігавыдаўцоў Беларусі. За сваю паўвекавую гісторыю конкурс павысіў мастацкую і паліграфічную культуру беларускай кнігі. Выданні-пераможцы, за працу над якімі ўручаны дыпломы Францыска Скарыны і памятныя знакі-сімвалы "Вялікі залаты фаліянт", выклікаюць захапленне не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Сёлета іх спіс папоўніўся яшчэ на дваццаць шэсць кніг-шэдэўраў, убачыць якія можна на кніжнай выставе-кірмашы.**

Выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" было прызнана таксама лепшым у намінацыі "Эўрыка" за выданне кнігі Рамана Матульскага "Из прошлого в будущее. Библиотеки Беларуси. Ч.I. — начало XX века", у намінацыі "Залатыя скрыжалі" за выданне энцыклапедыі "Максім Багдановіч". Што тычыцца выдання "Дмитрий Струков. Альбом рисунков. 1864—1867", якое перамагло ў галоўнай намінацыі "Трыумф", яно адзначана таксама за мастацкае афармленне. Дыпломы імя Францыска Скарыны і памятныя знакі-сімвалы "Вялікі залаты фаліянт" уручаны дырэктару выдавецтва Таццяне Бяловай і загадчыцы рэдакцыі мастацка-тэхнічнай падрыхтоўкі выданняў выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" Алене Сітайла. За паліграфічнае выкананне кнігі "Дмитрий Струков. Альбом рисунков. 1864—1867" пачэсную ўзнагароду атрымала выдавецтва "Беларускі Дом друку".

> **Выдаўцы з дваццаці краін свету прэзентуюць шэдэўры кніжнага мастацтва на XIX Міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы, што сёння адкрываецца ў Мінску.**

"Факсімільнае выданне акварэльных замалёвак вядомага мастака і архітэктара Дзмітрыя Струкава адлюстроўвае каля двухсот драўляных і мураваных цэркваў, з якіх да нашых дзён захавалася толькі шэсць, — расказвае дырэктар выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" Таццяна Бялова. — Каб паказаць сённяшняму пакаленню беларусаў, што сабой уяўляла наша краіна стагоддзі таму, добра было б, каб гэта кніга з'явілася ў кожнай школьнай бібліятэцы краіны".

Лепшым у намінацыі "АРТ-кніга" стаў фотаальбом "Минск. Города и люди. Фотографии Вадима Качана" выдавецтва "Артия-Групп". У намінацыях "ЛІТ-фармат" і "За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны" — перамог Беларускі фонд культуры за выданне камплекта кніг Максіма Багдановіча "Раманс. Пагоня. Слуцкія ткачыхі" і Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха". За выданне лепшага падручніка новага стагоддзя, якім быў прызнаны дапаможнік прописаў І.Боблы і іншых "Буквар-2", дыплом пераможцы атрымала выдавецтва "Вышэйшая школа". У намінацыі "Фотапогляд" пераможцам стала інфармацыйнае агенцтва БелТА за выданне фотаальбома ў 2 тамах "Беларусь созидающая". У намінацыі "Разам з кнігай мы расцём" перамагла рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і мастацтва", што выпусціла "Сказки тетушки Руфь" Наталлі Голубевай. У намінацыі "Духоўнасць" дыплом пераможцы быў прысуджаны Спаса-Еўфрасіньеўскаму жаночаму манастыру ў Полацку за выданне кнігі "Полоцкое радование". А ў намінацыі "Садружнасць" лепшай была прызнана кніга "Закон Божий" выдавецтва Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата. Дыплом пераможцы ў намінацыі "Майстэрства" за вялікі асабісты ўклад у развіццё кніжнай культуры Беларусі пасмяротна прысуджаны мастаку-графіку Мікалаю Казлову. За прапаганду чытання дыплом атрымаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі.

Акрамя кніжных шэдэўраў, выдадзеных айчыннымі выдавецтвамі, наведвальнікам XIX Міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, якая сёння адкрываецца ў Мінску, прапанавана пазнаёміцца з дасягненнямі ў кніжнай галіне Венесуэлы, Азербайджана, Арменіі, Германіі, Індыі, Ірана, Італіі, Ізраіля, Украіны, Францыі, Швецыі, Расіі, ЗША і іншых краін свету. Паспяшайцеся ў нацыянальны выставачны павільён "БелЭКСПА", што на вул. Янкі Купалы, 27. Падрабязней з праграмай кніжнай выставы можна пазнаёміцца на сайце Міністэрства інфармацыі Беларусі www.mininform.gov.by.

**Марына КУЗЬМІЧ, "НГ"**